БЕСПЛАТНЫЕ ЧАСТНЫЕ ОБЪЯВЛЕНИЯ В ГАЗЕТУ "УЗГОРАК" ПРИНИМАЮТСЯ В ПУНКТАХ ПРОДАЖИ И У РАСПРОСТРАНИТЕЛЕЙ.
РЫНОК "МАЛАЯ ЕВРОПА", 1-Й ЭТАЖ, МЕСТО 101 (ВТ-ПТ: 10.00-18.00, СБ, ВС: 10.00-16.00) МИНИ-РЫНОК БГСХА, ПН-ПТ: 10.00-17.00. ГОРОДСКОЙ РЫНОК, ВС: 8.00-14.00.





Горацкая газета
№38
12 верасня 2007

Узгорак

Кошт свабодны

Беларусь – перад усім





Чытаньні выклікалі вялікую цікавасьць і ў малых і ў старэйшых вучняў

Сябра Таварыства беларускай мовы Андрэй Юркоў перадаў настаўнікам трэцяй школы кнігі горацкай паэткі Ніны Кавалевай, напісаныя па-беларуску

Ляўрэаты з узнагародамі



У трэцяй школе прайшоў тыдзень беларускай пісьменнасьці, прысьвечаны 125-гадоваму юбілею клясыкаў нашай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Была зладжаная выстава літаратуры беларускіх пісьменьнікаў, праведзеныя тэматычныя клясныя гадзіны. Юныя мастакі прадставілі свае творы на тэму "Беларусь мая сінявокая".

Завяршылася сьвята чытаньнямі, у якіх прынялі ўдзел вучні ад першага да адзінаццатага клясу.

Сярод памятных прызоў, якія былі атрыманыя ўдзельнікамі, былі кніжкі горацкай паэткі Ніны Кавалевай, зь вершамі па-беларуску. У апошні час удзел у іх выданьні прымае Таварыства беларускай мовы. Дарэчы, сябры таварыства запрашаюць усіх, хто хоча спрыяць разьвіццю беларусчыны, да супрацоўніцтва. Гэта тычыцца, па-першае, творцаў – вашыя вершы, ці іньшыя літаратурныя творы, будуць абавязкова апублікаваныя, калі вы гэтага хочаце. Будуць станоўча ўспрынятыя практычна люыя йдэі, накіраваныя на разьвіцце нацыянальнай культуры ды захаваньне спадчыны. На будучым тыдні, дарэчы, сябры таварыства плянуюць зладзіць для вучняў беларускамоўных клясаў ды іх бацькоў экскурсію ў Мсьціслаў ды Пустынкі.

Іван МАРОЗАЎ

ЭХ, ДОРОГИ...

ГАИ

За прошедшую неделю горецкие автоинспекторы зафиксировали 142 нарушения Правил дорожного движения. Скорость превысили всего 8 человек, находившихся за рулем, зато непристегнутых водителей выловили аж 77. Пьяных тоже было рекордное (с 1 марта, когда введены новые административные санкции) количество – 14 за 7 дней.

За выходные задержаны двое пьяных "повторников", которые уже были пойманы в таком состоянии в течение менее чем 12 последних месяцев. Всего же нетрезвых водителей за рулем было выявлено за субботу и воскресенье шестеро.

ПЬЯНКИ И ГОНКИ

Не обошлось без ДТП. Одно из них было незначительным, а во втором случае тракторист ОАО РАПТ в ночь с субботы на воскресенье на ул.Фурманова по причине "поддатия" не справился с управлением и опрокинул в кювет прицепленную к трактору бочку.

Но это еще не все. Создается впечатление, что простых инспекторов на горецких лихачей уже не хватает и за дело приходится браться офицерам старшего звена. Об этом рассказали И.О. начальника ГАИ ст. л-т милиции Владимир Федоров и зам.начальника РОВД майор милиции Олег Дрень. Проезжая по городу, они обратили внимание на неадекватное поведение на дороге автомобиля БМВ пятой серии, выписывавшего "кренделя" на Бруцеро-Ерофеевской. Нарушив, все, что можно (точнее - нельзя) автомобиль на скорости, подходящей разве что для болида какой-нибудь "Формулы", умчался в направлении Орши.

В ходе преследования милицейские начальники зафиксировали целый букет нарушений, включая создание аварийной обстановки в населенных пунктах. В конечном итоге, патруль, стоявший в д.Сова, остановил "крутого водилу", коим оказался один из руководителей одного из крупнейших предприятий нашего города. Решивший поиграть "в Шумахера" мужчина, правда, был трезв. Просто он любит быструю езду и вот – решил "оторваться".

Итог этих "ралли" для "пилота болида" – сразу два административных протокола и немалый денежный штраф.

Иван МОРОЗОВ

В ЗАЧЕТ СПАРТАКИАДЫ

Завершилось первенство города по мини-футболу среди команд предприятий и организаций. Места в финальной четверке распределились следующим образом:

1.Горгаз, 2.Охрана, 3. ИУ-9, 4.РО ЧС

Соб.инф.

ЧЕМПИОНАТ ОБЛАСТИ – СНОВА ПЕРЕНОС

Очередной матч между командами Горок и Чаус не состоится, поскольку выигравшая Кубок области команда Чаус поедет в эту субботу в Ганцевичи играть с победителями Кубка Брестской области. А вот в среду, 19.09., Горки примут дома перенесенную ранее игру с "Серволюкс-Агро". Начало встречи в 16.00 на городском стадионе.

В прошедшие же выходные состоялись три матча:

Осиповичи–Шклов – 1:3, Чериков–Белыничи – 1:2. Серволюкс-Агро–Кричев – 3:0 (неявка Кричева)

Как видим, в чемпионате сменился формальный лидер, однако у Кировска есть все шансы вернуть себе это звание – у команды две игры в запасе. Помешать это сделать кировчанам могут и Горки - в четверг, 13.09, когда газета уже будет отпечатана, наши сыграют с ними на выезде.

Таблица на среду, 12.09.

№	К	И	М	О
1	Шклов	15	44-22	33
2	Кировск	13	35-17	31
3	Серволюкс-Агро	13	41-17	27
4	Чаусы	14	36-20	25
5	Горки	13	35-29	22
6	Осиповичи	13	35-20	22
7	Белыничи	16	23-34	21
8	Чериков	15	21-39	13
9	Кричев	16	23-39	8
10	Краснополье	18	17-70	2

Иван МОРОЗОВ

ХІБЫ НАШАГА "ПАРНАСА"

Калі казаць, што ў Горках часам ладкуюцца імпрэзы на белмове, дые тое не так... Не часам, але вельмі зрэдку! І "Горацкі Парнас", што адбыўся 6 верасьня ў РЦК, ці ня першая такая агульнагарадзкая справа ў бягучым годзе.

Пачнем з афішы. Нас запрашалі на прадстаўленьне аб'явай, дарэчы з густам аформленай, ды толькі на расейскай мове, хаця канцэрт цалкам прайшоў на роднай. Такім чынам, патэнцыйны глядач застаўся заблытаным, бо ў афішы не было ўказана, што маючая адбыцца імпрэза, ёсьць прысьвячаная Дню беларускай пісьменнасьці дый паўтарае тую, якая мелася ў Шклове 2 верасьня (аб тым хадзілі адно чуткі). І вось збланатаны глядач-слухач пачаў пакідаці залю на другой палове канцэрту, бо навошта месьцічу, не ўлюбленаму ў мову, змагацца са сваёй абрусіфікаванае сьвядомасьцю - гэтая справа, людцы--падабае на раздваеньне асобы...

Наконт зьместа імпрэзы. Уражаньні лагоднымі былі напачтку ды цяпер - наступнае раніцай, калі я пішу гэныя радкі. Адразу жа апасля заканчэньня, калі зьніцаўшым адрэналін энтузыязму, я быў атручоным жоўчу зь відавочных хібаў. Найперш слушным было, што аніхто з ўдзельнікаў, (за выключэньнем паэткі Лідзіі Анрэевай), не валодае простай вуснай беларускай гаворкай, можа і замешанай на падмурках горацкае трасянкі, але зболшьа беларускагучнай, ды не абрасеянай. Пакуль сьпяваліся куплеты са сьмяшынкамі, чыталіся вершы на памяць ды зь ліста, выконваліся рамантычныя песьні ды патрыотыка, то ўсё чулася б мілагучным... Но калі са сцэны зьвярталіся наўпрост да публікі, то адразу адчуваўся дысананс, запінкі, калькі з расейскай і г.д. Вынікае з гэтага сумная выснова: ў штодзённам жыцьці, ў сям'и, нашы "вершаплёты" роднае мовай не карыстаюцца, але сілкуюцца, калі да іх з Парнаса заляцае сьціплая Муза, апранутая беларускім строям.

Наогул здаўнавядома, што вершы лягчэй пісаць чымсі прозу (ў сэнсе мажлівасцяў выраза думак ды валоданьня слоўнікавым багажом), Можа таму на "Горацкім Парнасе" не было ані апавяданьня, ані гумарэскі, ані філязофскага маналёгу, казаных нашае тутэйшай моваю, а таму напрамкі даступных усім. Не ставала вяскоўцаў, што наогул незразумелым, калі трапіна району есьць сельскімі жыхарамі.

Больш складаная справа паспрачацца за рэжысуру ды сцэнаграфію імпрэзы. Яўна не мяркавалі пастаўшчыкі пра кульмінацыю, пра сьлёзы ды катарсіс, пра рэйку выканаўньня ніжэй якой нельга апускацца. Іх апанавала ідэя заладзіць карагод паэтаў па чарзе, але па-за ўвагай засталося тое мяркаваньне, што паэт мае звычайным чынам разнакалярован суквецьце твораў: і лірыку, і грамаду, і гумар. Напрыклад зьблізу ў канцерце выконваліся сур'ёзныя спевы на словы Алеся Клоча й Лідзіі Андрэевай сэнса высокага, кшалту оды ці гімна... Каб іх развялі за часам, дык паасобку яны б аказалі належнае ўражаньне, а так проста "забілі" адзін адное.

А вось другую задумку аўтараў наконт прадстаўленьня Музаў, Зеўса, Тарасу з Парнасу трэба толькі ўхваліць, як і выканаўцаў гэтых роляў. Больш таго – лічу, што ндрэнна былоб калісьці паўтарыць з разьвіцьцём, ўпляценьнем ў сюжэт гэтай легендарнай паэмы нашай зямлі.

Што да ўдзельнікаў, дык справу выцягнулі нашы яснавяльможныя паэткі-кабеткі, хаця й было дзьва мужчынкі (Андрэй Пугач і Міхаіл Уласенка). Яны хутчэй сапсавалі, чым надбалі, бо выступалі зацянута й нудна, з "сухім ротам", за адсутнасьцю жаданьня й імпэту апантаваць залаю, што не касаецца "пугачоўскіх" сьпеваў--тутка нешта знутры ёнкула... А мкненьне спадара Уласенкі выразіць на мове свае "дробязі" пакуль не спраўдзілася, бо ў бальшыні гучаў дрэнны аўтарскі пераклад з расейскай (гл. першавыток: "Мелочи жизни" ў "Рэгіянальцы"), хаця й тут публіка ўсміхалася, але за адсутнасьцю лепшага. Цікава, што Горкі маюць маладых паэтаў: Аксана Адзінцова, Вольга Восіпава ды сталых: Алесь Клоч, Лідзія Андрэева, Сьвятлана Цярэшка... а межамі 30-40 гадовых і не бачна. Дзе гэта пакаленьне брэжняўскага застоя, гарбачоўскай перабудовы і адраджэнчаскай хвалі пачатка 1990-х? Ау-у!

Не прадстаўленай на ймрэзе засталася і сучасная маладзёвая музыка: белмоўны рок, панк, рэп,--яны маюцца ў Горках, ды іх не запрашаюць на, паўтаруся адзіная агульнагарадское такое мерапрыемства, а моладзь, годную да нашай мовы не выхаваць бязь ўнікненьня іхнімі зацікаўляньнямі.

Магчымым, чытаючы мае ўражаньні й высновы, вы зьлічыцё іх залішку патрабавальнымі, але згадзіцеся, што калі не ставіць перад сабой выкальштаваных мэтаў, не змагацца за мову ўсёя сілай сваёю, не казаць праўды найперш сабе самім, то яна наогул зьнікне з вонкавага ўжываньня, застаўшыся адно нейдзе знутры нас - яеных носьбітаў, дзеля карыстаньня сам насам, што ёсьць нездаровым, больш таго - заганным.

Паўлюк Сяды,
тэл. 56648,3579471

СУПРАЦЬСТАЯНЬНЕ

У ВОРШЫ ЗАТРЫМАНЫЯ АКТЫВІСТЫ З ГОРАК

Мікрааўтобус, якім ехалі актывісты на фэст беларускай аўтарскай песьні і паэзіі "Аршанская бітва-2007", міліцыянты спынілі нібыта для праверкі дакумэнтаў кіроўцы. Затым на гэтай жа машыне актывістаў даставілі ў пастарунак.

Адна з затрыманых, Ірына Каралькова, паведаміла "Свабодзе", што міліцыянты ў кожнага правяраюць пашпарты ды праводзяць прафіляктычную гутарку. Асноўнае пытаньне – куды едзеце і навошта.

Радыё Свабода

КРАПІВЕНСКІ ФЭСТ УСЁ-ТАКІ АДБЫЎСЯ

Нягледзячы на ўчарашнія масавыя затрыманні ноч на Крапівенскім полі пад Оршай правялі 170 чалавек. Яны палілі тры вогнішчы. Адбыўся і бардаўскі канцэрт.

Ноч прайшла спакойна, а вось раніцай 9 верасня затрыманні працягнуліся. На дадзены момант дакладна вядома, што ў аршанскім РАУСе працягваюць знаходзіцца трое затрыманых – мастак Алесь Пушкін, а таксама маладафронтаўцы Алена Макарэвіч і Аляксей Янушэўскі, піша "Наша ніва".

НА КРАПІВЕНСКІМ ПОЛІ АРЫШТАВАНА КАЛЯ 40 ЧАЛАВЕК

Сярод затрыманых – Дзяніс Садоўскі, сакратар аргкамітэту па стварэньні "Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі". Яго павезьлі ў шпіталь. Міліцыянты абвінавачваюць хлопца ў супраціве і непадпарадкаваньні міліцыянтам. Разам зь Дзянісам знаходзіцца міліцыянт, які сьцьвярджае, што Дзяніс нібыта падрапаў яму руку.

У міліцэйскім аўтобусе знаходзяцца Андрэй Шарэнда, кіраўнік Берасьцейскай філіі "Маладога фронту", менскія актывісты Алена Макарэвіч, Кацярына Краснова, Кацярына Галіцкая, Зьміцер Хведарук, Натальля Старасьціна, аршанскія актывісты.

На вакзале шмат міліцыі. Затрыманыя актывісты "Маладога фронту" з Жодзіна, сярод якіх – Павал Красоўскі. Міліцыянты сустракаюць цягнікі з Магілёва, Гомеля і Віцебску, у якіх на імпрэзу едуць некалькі дзесяткаў моладзевых актывістаў.

Наша карэспандэнтка перадае зь месца падзеяў:

Станкевіч: "Я знаходжуся цяпер каля вёскі Гацькаўшчына, у 300 мэтрах ад Крапівенскага поля, дзе сёньня ў 17-ы раз мусіў адбыцца бардаўскі фэст "Аршанская бітва". Месца правядзеньня фэсту заблякаваная міліцыяй, перакрытае міліцэйскімі машынамі.

Людзі ўсё адно зьбіраюцца і гуртуюцца невялікім групамі. Тых, хто прыехаў зь нейкім транспартам, затрымліваюць, затрымалі ўжо каля 40 чалавек. У Аршанскім райаддзеле міліцыі – Алесь Пушкін, а ў Дубровенскім – Юры Копцік, адзін з заснавальнікаў традыцыі правядзеньня фэсту. Пэрспэктывы няясныя, афіцыйны пачатак – а 20-й вечара, і, магчыма, актывісты знойдуць месца, дзе сабрацца, і фэст усё-ткі пройдзе".

Супрацоўнікі міліцыі займаюцца пошукам выбуховых прыстасаваньняў на Крапівенскім полі зь вечара 7 верасьня. "З учарашняга вечара тут знаходзяцца міліцэйскія пасты, на месца правядзеньня фэстывалю не прапускаюць ні транспарт, ні людзей. Як нам патлумачылі, у Дняпры, у тым месцы, дзе ў яго ўпадае рэчка Крапівенка, шукаюць нейкія міны або снарады", – сказаў адзін з арганізатараў фэстывалю, аршанскі краязнаўца Юры Копцік.

Радыё Свабода

ВОРША: ДЗЯНІСА САДОЎСКАГА ПАКАРАЛІ 5 СУТКАМІ АРЫШТУ

Аршанскі суд пакараў сакратара аргкамітэту ў стварэньні "Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі" Дзяніса Садоўскага арыштам на 5 сутак. Дзяніса Садоўскага затрымалі 8 жніўня каля Крапівенскага поля, куды прыехалі моладзевыя актывісты адзначыць Дзень беларускай вайсковай славы.

Затрыманага Дзяніса Садоўскага міліцыянты адвезьлі ў шпіталь, адзін з іх сьцьвярджаў, што Дзяніс нібыта аказаў супраціў і падрапаў яму руку. Міліцыянты патрабавалі, каб Дзяніса праверылі на ўжываньне алькаголю.

Сёньня аршанскі суд пагадзіўся з абвінавачаньнямі міліцыянтаў у дробным хуліганстве і пакараў Дзяніса арыштам на 5 сутак.

Любоў Лунёва, Радыё Свабода

Прывіды на дарозе

"ПАДЫМАЮЦЦА З МАГІЛАЎ АБЛЕЗЛЫЯ ЦЕНІ..."

Віктар ШАЛКЕВІЧ



Практычныя заняткі па гісторыі ў палявых умовах - нязручна, затое цікава



Гэраічная спэцапэрацыя па зачыстцы ад праўдзівых фатаздымкаў праведзеная пасьпяхова

ЛЮДЗІ, ЯКІЯ ЛІЧАЦЬ СЯБЕ АФІЦЭРАМІ, РАБІЛІ ЎСЁ, КАБ САРВАЦЬ СЬВЯТКАВАНЬНЕ ДНЯ БЕЛАРУСКАЙ ВАЙСКОВАЙ СЛАВЫ

У мінулую суботу больш за трыццаць жыхароў Горак рушылі ў бок Воршы, дзе на Крапівеньскім полі павінна было адбыцца сьвяткаваньне чарговых угодкаў перамогі беларускага войска над маскоўскімі інтэрвэнтамі. І хаця арганізавала гэтую паездку мясцовая Кааліцыя дэмакратычных сілаў, нельга казаць, што мэтай яе была нейкая палітычная акцыя. У дарогу запрасілі ўсіх, каму гэтае сьвята было цікавае.

Людзі зьбіраліся ў добрым настроі, спадзяючыся паглядзець канцэртную праграму (а мо хто й сам хацеў нешта сьпець, альбо расказаць са сцэны), некаторыя ехалі сем'ямі, было нямала дзяцей. Добрыя клумкі ў руках амаль кожнага, хто сабраўся ў даргогу, сьведчылі аб намеры грунтоўна павячэраць на сьвежым восеньскім паветры ля вогнішча ў кампаніі аднадумцаў, завесьці новыя знаемствы, паразмаўляць на роднай мове, не чакаючы, што калі яе хтоцьці пачуе, то пачне па-дзікунску азірацца ды ўсьміхацца. Той-сёй зьбіраўся перакуліць і чарку-другую, ушанаваўшы памяць гэтмана Канстанціна Астрожскага ды ягоных вяяроў, якія восьмага верасьня 1514 года абаранілі сваю краіну ад варожага нашэсьця. Да таго ж, сьвяту спрыяла нядрэннае восеьскае надвор'е...

...Калі пасьля павароту ў бок Дуброўны на дарозе стаў бачны даволі шматлікі натоўп, то адразу падумалася, што гэта нейкія здані зь мінулага. Здавалася што фантомы маскоўскга войска зноў стаяць на Крапівеньскім полі, а ахоўныя кардоны паўстаўшых з таго сьвету жудасных прывідаў і цяпер сьцерагуць даргоу, каб не дазволіць прайсьці туды гаспадарам гэтай зямлі - беларусам. Хоць і ня надта веру ў Бога, але ўзьнікла жаданьне перахрысьціцца. Ды не пасьпеў: машына пад'ехала бліжэй і стала ясна, што супраць ГЭТЫХ аніякі Сьвяты крыж не дапаможа – з двох бакоў аўтатрасы стаялі нарады міліцыі.

Канешне, ахова грамадзкага парадку – рэч на такіх мерапрыемствах неабходная. І калі б у супрацоўнікаў Аршанскага гараддзелу ўзьнікла такое жаданьне, то яно магло быць толькі ўхваленае. Але тым зараз было не да парадку. На падставе ўбачанага уласнымі вачыма, бяруся сцьвярджаць, што людзі, якія лічаць сябе АФІЦЭРАМІ, мелі мэтаю якраз-такі адваротнае. Яны павінныя былі ўнесьці дззарганізацыю ў рады сьвяткуючых і у рэшце рэшт – САРВАЦЬ У КРАІНЕ ДЗЕНЬ ВАЙСКОВАЙ СЛАВЫ. Як напісаў калісьці нехта з расейскіх літаратурных клясыкаў, "Тащить и не пущать".

Дарэчы, кардонаў на падыходзе да поля было некалькі. На першым зь іх "шманалі" толькі аўтобусы. Нашыя чатыры легкавікі праехалі далей. Горацкі ж бус, які рухаўся сьледам за намі, затрымалі і бяз аніякіх тлумачэньнняў адправілі ў Воршу, у гараддзел, нешта там высьвятляць. Як праходзіла "высьвятленьне", вы можаце даведацца с матар'ялаў незалежных медыяў, якія мы друкуем побач, а таксама са сьведчаньняў тых, хто ехаў у мікрааўтобусе. Мэтаю, як бачна, было адно – пацягнуць час, каб не пусьціць людзей на сьвята. Ніякіх абвінавачваньняў у аддзеле нашым землякам прад'яўлена не было (ды й што прад'яўляць?), на бессэнсоўныя пытаньні, кшталту "адкуль-куды-навошта" ўсе адказвалі шчыра, не разумеючы, чаго тут ад іх ўвогуле хочуць.

Тыя, хто здолеў праехаць-такі да павароту на вёску Гацькаўшчына (побач з Крапіўнай, па гэтай дарозе й трэба ехаць да славутага поля) наткнуліся там на шматлікі нарад зь людзей у пагонах з зоркамі. Не хачу называць іх афіцэрамі, бо ня маюць яны права так зваццa. Афіцэр, наколькі мне зразумела, гэта, як мінімум, чалавек з павагаю да сябе, уласным гонарам. А тут – так – служкі, якія хлусяць у вочы, баяцца быць сфатаграфаванымі, і... "нічога ня ведаюць", маўляў, мы не пры чым – гэта ўсё начальства.



Пакуль удзельнікі горацкай групы рабілі здымкі на памяць, аршанскія міліцыянты палахліва зьбеглі нават ад сваей машыны — так баяліся трапіць у кадар

Затое зь якім смакам адзін зь іх распавеў пра хлопца зь гітараю, якога яны не пусьцілі прайсьці да поля, і які, сеўшы прама на дарозе, пачаў сьпяваць. "Мы яго ў аддзел завезьлі!"

- Дык можа ен і сьпяваў па-беларуску? – Задаў пытаньне дрыбінскі вэтэран Мікалай Юркоў.

- Да, по-белорусску, - тут жа адказаў адзін зь пільных "стражаў".

Прысутныя засьмяяліся.

Што наконт начальства, дык Мікалай Федаравіч нагадаў ім, што й на Нрнбергскім працэсе ўсе падсудныя таксама сьцвярждалі, што выконвалі загады.

- Я не разумею, чаму мне не даюць прайсьці па маей беларускай зямлі? – Не ўнімаўся спадар Юркоў, - я гэтага так не пакіну!

- Ды там міна ляжыць, ачапленьне саперы...- завучана тлумачыў міліцыянт.

- Дык што, аж з 1514-га года гэтая міна ляжыць? – Спытаў нехта.

Зноў агульны рогат, але ТЫМ хоць бы што. Убачыўшы дзяўчыну з Полацака, якая ў адкрытую фатаграфавала падзеі, вартаўнікі парадку гераічна кінуліся да яе, затрымалі ды пачалі "сьледчыя дзеяньні". Разумелі, напэўна, што хутка надыдзе час, і здымкі тыя могуць стаць небясьпечнымі доказамі.

Дарэчы, дзякуючы знаходлівасьці двох удзельнікаў горацкай групы, якія, рызыкуючы, здолелі абысьці баязьлівыя міліцэйскія забароны на карыстаньне фатакамарамі, нашыя чытачы маюць магчымасьць крыху пабачыць, як там усе адбывалася. Некаторыя здымкі, праўда, рабілася на мабільны тэлефон, таму якасьць – ня вельмі добрая.

Людзей тым часам усе прыбывала й прыбывала. Хто выходзіў з праяжаючых рэйсавых аўтобусаў, іньшых падвозілі папуткі. Бачачы бэссэнсоўнасьць супрацьстаяньня, прысутныя прама на прыпынку зладзілі кола, ў цэнтры якога апынуўся горацкі гісторык, кандыдат навук Аляксандар Каданьчык. Нячаста выкладчыкам даводзіцца праводзіць практычныя заняткі па сваім прадмеце ў палявых умовах і нячаста іх слухаюць з такою ўвагаю. Навуковец на працягу каля дзесяці хвілін распавядаў пра падзеі, якія адбыліся на гэтай зямлі напачатку XVI стагодзя.



Нялішнімі аказаліся тут і некалькі дзясяткаў асобнікаў мінулага нумара нашай газэты з артыкулам спадара Каданьчыка пра даўнюю бітву.

Урэшце, большасьць людзей раз'ехалася. Але нехай ня думае ўсялякая нечысьць, нібы ўсе скончылася на яе карысьць. Прыдзе час – пераможам, як нашыя продкі. І будзе гэтая зямля сапраўды беларускай, 8-е верасьня – дзяржаўным сьвятам, а прывіды сыйдуць у ад, дзе ім і месца.

Эдуард Брокараў

СЬВЕДЧАЦЬ УДЗЕЛЬНІКІ ПАДЗЕЯЎ:

Ірына Каралькова:

Абыходзіліся з намі ў аддзеле карэктна, на людзей ня ціснулі, толькі пыталіся ўвесь час, навошта мы туды ехалі. Мне дзіўна, што супрацоўнікі міліцыі да такой ступені ня ведаюць гісторыі свaей краіны. Быў час – яны ў гэты дзень Прысягу прымалі. Я ім шмат пра тое распавядала.

Андрэй Юркоў:

Значэнне Аршанскай бітвы я пачаў разумець пасьля знаёмства з Польшчай, бо ў нас праўда пра гэту бітву заўсёды была за сям'ю пячаткамі, а спробы прыадчыніць для простага чалавека завесу таямніцы дэмакратычнай грамадурасцю, заўжды патыкалася на мур дзяржаўнай ідэялёгіі. У Варшаве ёсць "Музэй нарадовы", дзе знаходзіцца карціна "Аршанская бітва". Уражвае любога, паверце, чалавека. Увогуле, у Эўропе гэтую бітву ў шэрагу з Грунвальдзкай, лічаць самай значнай у гісторыі абароны сваіх земель славянамі. І тое што ў суботу мы пабачылі пад Воршай, той жах уладаў, ад таго, што людзі ў Белорусі перастаюць быць бязвольнымі рабамі, якім дастаткова чаркі і шкваркі, а зноў хочуць "людзьмі звацца", шчыра радуе. Сёлета нас там было сотні і трэба працаваць, каб у наступным годзе прыйшлі тысячы. І нічога нам не зробяць, а будзе сапраўднае сьвята годных сыноў і дачок Бацькаўшчыны.

КАРОТКІМ РАДКОМ

У БАБРУЙСКУ ЗЬБІРАЮЦЦА ПРАТЭСТАВАЦЬ СУПРАЦЬ АДМЕНЫ ЛЬГОТАЎ

Заяўку на правядзеньне 30 верасьня пікету супраць адмены льготаў і сацыяльнай палітыкі дзяржавы падалі ў Бабруйскі гарвыканкам актывісткі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі "Грамада" Алена Мядзьведзева, Ірына Міцура ды беспартыйная Вераніка Папко.

Плянуецца, што ў пікеце возьмуць удзел да пяцідзесяці чалавек. Акцыю ініцыятары мяркуюць правесьці на стадыёне на вуліцы Ўрыцкага, 76 — у тым месцы, якое вызначыла для такіх мерапрыемстваў улада.

Папярэднія спробы правесьці акцыі пратэсту мясцовая ўлада блякавала.

Радыё Свабода

ВІЦЕБСКІЯ ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ ЗБІРАЮЦЦА МІТЫНГАВАЦЬ

Учора адпаведная заяўка пададзена ў мэрыю. Яе падпісалі 9 актывістаў аб'яднання "Перспектыва", якія працуюць на "Полацкім", "Смаленскім", "Паўднёвым" рынках, у гандлёвым цэнтры "Эвіком", а таксама ў шапіках горада.

Прадпрымальнікі просяць дазволіць ім правядзенне мітынгу ў парку імя 30-годдзя УЛКСМ 24 верасня. У часе мітынгу дробныя гандляры збіраюцца пратэставаць супраць указаў прэзідэнта, якія змушаюць іх змяніць статус на прыватныя унітарныя прадпрыемствы і не браць наёмных работнікаў, апрача блізкіх сваякоў. У сталіцы актывісты "Перспектывы" атрымалі дазвол на правядзенне аналагічнага мітынгу 10 верасня.

ЕС АДХІЛЯЕ ПРАПАНОВЫ АФІЦЫЙНАГА МІНСКУ

Еўрасаюз выказвае занепакоенасць чарговымі арыштамі грамадскіх актывістаў у Беларусі.

Паводле словаў прэс-сакратара Еўракамісіі Крысціяны Гоман, хваля рэпрэсій "ставіць пад сумнеў гатоўнасць Беларусі супрацоўнічаць з Еўрасаюзам".

Яна заявіла, што ЕС адхіляе прапановы афіцыйнага Мінску аб больш шчыльным эканамічным супрацоўніцтве, у прыватнасці, у транзіце энергарэсурсаў, бо ўмовай супрацоўніцтва з'яўляюцца дэмакратычныя змены ў Беларусі.

Прэс-сакратар Еўракамісіі падкрэсліла, што Еўрасаюз не дазволіць аўтарытарнаму кіраўніцтву Беларусі перабіраць, у якіх сферах супрацоўнічаць.

Радыё Рацыя

Жертвы "школы коммунизма"*

На днях довелось увидеть довольно интересную статистику: с 2002-го года цены в Беларуси выросли в 2,3 раза, а курс доллара – повысился только на 36%. Это означает, что рост заработков в долларах может и близко не покрыть инфляцию (рост цен) в рублях. Также интересными мне показались рассуждения в одной из центральных "чэсных" газет насчет того, как живет "обычная" семья из трех человек, где оба взрослых работают на средний заработок (650тыс.+ 650тыс.=1300000 в месяц). И получилось, что семья сумеет сберечь за месяц аж 100000 рублей! Далее "чэсныя" газетчики рассуждают, куда вложить эти деньги: положить в банк, отложить на компьютер или велосипед сыну, сходить в ресторан...

Богатеи, ничего не скажешь, но пусть бы наши районные статистики вместо надоевших передовиц в "Ленинском шляхе", или "Советской веске", а в последнее время – и в "Региональных ведомостях" о надоях и росте ВВП дали данные о том, на какие деньги живет средняя горецкая, или дрибинская семья: у стольких процентов – такой доход, у стольких – такой... Но этого не будет, поскольку картина получится весьма неприглядной и такую информацию власти стараются прятать от нас, уважаемые обыватели, подальше, как от греха, за ширмами различных гостайн.

В принципе, ни один наниматель не стремится платить своим работникам слишком много. Поскольку у нас этим нанимателем является государство, то и ведет она себя подобно какому-нибудь кровососу из недр капитализма. Вспомните, уважаемые обыватели, сколько "весили" сто долларов пять лет назад и сколько они "весят" сегодня. Можно много рассуждать на эту тему, но ощущение основной массы моих друзей и знакомых такое: раньше благосостояние хоть понемногу, да росло. А вот в последние 2-3 года рост доходов словно уперся в невидимую стену и единственная возможность свести концы с концами – поездки на работу за границу.

Когда же начинаю расспрашивать людей, кто по их мнению виновен в такой ситуации, слышу ответ: известно – начальство. Ну, хорошо – не знает пока наш простой человек, что существуют другие экономические и политические системы и потому – сколько не улучшает начальство старую советскую, пользы не будет. Но почему тогда мы не пробуем отстаивать свои права и интересы хотя бы перед начальством? Виной всему, очевидно, страх. Почти столетие всех, кто шел против течения, вырезали под корень. А посему желающих практически не осталось. Похожей на нашу была ситуация в Европе 100-150 лет тому назад. Но понемногу люди начали объединяться в разные организации (профсоюзы, например) и бороться за свои права. Многотысячные забастовки, голодовки, самоотверженность лидеров профсоюзного движения со временем заставили нанимателей сесть за стол переговоров и с расчетами в руках договариваться об уровне заработков, а фактически – о разделе прибылей.

И только после этого народ получил достойную жизнь, поскольку знал, сколько есть денег на предприятиях и реально обрел возможность участвовать в определении направлений развития экономики. У нас же все по-старому. Простой люд и близко не знает, какими средствами "ворочает" предприятие, а точнее – начальство. Профсоюзные лидеры сидят тихонько на "теплых" местах и даже не интересуются реальным уровнем жизни трудящихся. А сами трудящиеся, получив в конце месяца жменьку "зайчиков", не знают, что делать, поскольку на "чарку и шкварку" хватает и бузить, вроде бы и не с чего, а достойной, полнокровной жизни тут не было никогда, потому в нее уже и не верится, хоть лопни. А без понимания другого жизненного уклада и веры в победу справедливости бороться за лучшую долю никто не станет.

Поэтому, учитесь, уважаемые обыватели, читайте не только "правильные" газеты, но и те, что властям не нравятся. Присоединяйтесь к независимым профсоюзам, участвуйте в негосударственных образовательных программах, и тогда вместе мы изменим наш край к лучшему.

Андрей Юрков, тел. 623 61 08

"Школой коммунизма" в советские времена официальная пропаганда называла профсоюзы.

Мітынг прадпрымальнікаў на Бангалоры

У Менску на плошчы Бангалор мае адбыцца мітынг прадпрымальнікаў. Ініцыятар акцыі – грамадскае аб'яднаньне "Пэрспэктыва". Прадпрымальнікі рэчавых і харчовых рынкаў зьбіраюцца абмеркаваць рэзалюцыю пратэсту на прэзыдэнцкія ўказы - №302 і №760. Ці ведаюць дробныя бізнэсоўцы пра мітынг, ці зьбіраюцца туды прыйсьці?

На гандлёвым рынку Ждановічы, як зазвычай у выходныя, – шумна ды тлумна. Што ведаюць гандляры пра мітынг прадпрымальнікаў, які мае адбыцца 10 верасьня на плошчы Бангалёр а 12-й гадзіне, я іду высьвятляць у гандлёвы цэнтар "Сьвет моды". Менавіта там колькі тыдняў таму падчас канфлікту супрацоўнікаў падатковай інспэкцыі і гандляроў адбыўся спантанны мітынг.

Першая мая суразмоўца, маладая дзяўчына, гандлюе верхняй вопраткай. Пакупнікоў на кропцы няма, і яна ахвотна падтрымлівае гутарку.

Гандлярка: "Ведаюць".

Карэспандэнтка: "А Вы асабіста зьбіраецеся туды пайсьці"?

Гандлярка: "Мяркую, што так, пайду".

Карэспандэнтка: "Як лічыце, мітынг дапаможа нечага дамагчыся"?

Гандлярка: "Хацелася б спадзявацца, але, калі шчыра, спадзеву мала. Вось так я мяркую".

Карэспандэнтка: "На Ваш погляд мітынгу дастаткова, ці страйк, пра які ішлі размовы раней, можа стацца болей эфэктыўным"?

Гандлярка: "Я лічу, што апроч мітынгаў трэба яшчэ нешта на роўні дзяржавы прадпрымаць. Трэба шукаць сустрэч з прэзыдэнтам, зь нейкім высокім кіраўніцтвам. Мітынг ёсьць мітынгам. Яго ня надта заўважаць, бо часьцей за ўсё ўдзельнікаў няшмат зьбіраецца".

"Мы не размаўляем!!!"

На другой кропцы мы пасьпелі толькі пачаць гутарку з усьмешлівай гандляркай:

Карэспандэнтка: "Пра мітынг, якія адбудзецца заўтра, ці ведаеце"?

Жанчына: "Чуць – чула, так".

Карэспандэнтка: "А дзе ён, калі – ведаеце? Пойдзеце?"

На гэтым моманце да нас імкліва падышоў гаспадар кропкі:

Мужчына: "Дзякуй, мы не размаўляем".

У суседнім боксе, пачуўшы слова мітынг, таксама сталі адмахвацца.

Спадар: "Мы задаволены жыцьцём, нас усё цалкам задавальняе, усё добра"!

Спадарыня: "Хто працуе – той і ежу мае! Усё нармальна"!

"Ці будзе плён? Бясспрэчна!"

А вось гандляр скуранай вопраткай, мужчына ў сталым веку, разьвітаўся з чарговым пакупнікам і адказаў мне безапэляцыйна.

Спадар: "Усе ведаюць, усе прыйдуць. Не турбуйцеся! Прыходзьце туды, і ўсё пабачыце на ўласныя вочы.

Карэспандэнтка: "А як Вы думаеце, будзе плён у гэтага мітынгу"?

Спадар: "Будзе. Бясспрэчна".

Наступны мой суразмоўца таксама пэўны, што мітынг прадпрымальнікаў будзе мець плён.

Гандляр: "Ведаю пра яго. Абавязкова прыйдзем. Спадзяёмся, можа наша ўлада... Ну, прыслухаецца да прадпрымальнікаў... Што-небудзь зробіць, каб усё ж лягчэй ды лепей нам працавалася, каб ня толькі сваякоў можна было прымаць на працу, але і суседзяў, і яшчэ каго-небудзь – каб стварыць новыя працоўныя месцы ды працаваць на карысьць нашае радзімы"...

Паводле указу № 302, па словах лідэра "Пэрспэктывы" Анатоля Шумчанкі, індывідуальныя прадпрымальнікі мусяць перайсьці ва ўнітарныя прадпрыемствы. Юрыдычны адрас трэба будзе рэгістраваць па месцы жыхарства, а ўласьнік гэткага жылога памяшканьня ня можа перашкаджаць правядзеньню праверак, рэвізіяў фінансавай дзейнасьці".

Паводле Указу №760 індывідуальныя прадпрымальнікі маюць права наймаць на працу толькі ўласных сваякоў ды родных. У іншым выпадку яны мусяць зарэгістраваць сябе як юрыдычную асобу.

Радыё Свабода

ЦЕНЫ НА РЫНКЕ

г.Горки*, вторник, 11 сентября

Наименование	Центральный рынок	Мини-рынок БГСХА
Картофель, 5л.	3000	3000
Огурцы, кг	1500	
Лук, кг	1500	1500
Чеснок, головка	3 на 1000	400-500
Яйцо, дес.	2500	
Перец сладкий, кг.	1500	3000
Капустаё, кг	800	
Свекла, кг	600	
Перец горький	3 на 1000	500
Малина, 0,5 л.	1000	
Фасоль, стакан	500-1000	
Морковь, кг.	1000	
Укроп, пучок		400-500
Кабачок, шт		500
Помидоры, кг		2500

*** Цены взяты у продавцов продукции с частных подворий**

ПРА ШТО ПІСАЛІ БЕЛАРУСКІЯ ГАЗЭТЫ 10 ВЕРАСЬНЯ

"Савецкая Беларусь" у 1927 годзе пад загалоўкам "Колькі важыць кропка над "і" піша: "З якой дакладнасьцю можна важыць у сучасных лябараторыях, паказвае наступны вопыт. Вопыт рабілі так: на кавалачку паперы было напісана слова, у якое ўваходзіла літара "і", прычым кропка над ёй спачатку ня была пастаўлена. Паперку зважылі, затым паставілі кропку і зноў зважылі. Розьніца вагі дала чыстую вагу кропкі. Аказалася, што кропка важыць адну 800.000 долю грама".

"Бацькаўшчына" на гэтым тыдні 1957 году пад загалоўкам "Дэструктары" разважае: "Кажнае палітычнае дасягненьне, царкоўнае, культурнае, навуковае ці мастацкае адразу сустракае ў іх лаянку. Складаецца пераканаьне, што іхныя друкаваныя "ворганы" спэцыяльна й існуюць дзеля разбуральнай дзейнасьці. Варта толькі здарыцца нейкаму канструктыўнаму чыну на карысьць Беларусі, як выходзяць іхныя бульварныя газэткі, каб ачарніць здабытае зь вялікімі цяжкасьцямі дасягненьне".

БЕСПЛАТНЫЕ ЧАСТНЫЕ ОБЪЯВЛЕНИЯ В ГАЗЕТУ "УЗГОРАК" ПРИНИМАЮТСЯ В ПУНКТАХ ПРОДАЖИ И У РАСПРОСТРАНИТЕЛЕЙ.
РЫНОК "МАЛАЯ ЕВРОПА", 1-Й ЭТАЖ, МЕСТО 101 (ВТ-ПТ: 10.00-18.00, СБ, ВС: 10.00-16.00) ГОРОДСКОЙ РЫНОК, ЕЖЕДНЕВНО С 8.30-13.30.

ПРОДАЮ

Жилье, недвижимость

2 к.кв. Строителей. Т. 602 74 97
2 к.кв. Т. 741 54 71
2к. кв. 20000у.е. Т. 5 20 56
2к. неприват. кв. Академия, или сдам за 80 у.е. Т. 642 31 53
3 к. кв. 2-й этаж, рядом гараж. Академия. Т. 5 61 52, Корнеев
3 к. кв. по ул. Суворова. Т. 5 33 91
3к кв. Дзержинского-2. Т. 5 39 61, 247 71 86
3к. кв. с евроремонтом. Т. 681 75 35
3к. кв., варианты. Т. 607 53 97
3к.кв. Академия. Старый дом. Можно под производство. Т. 5 89 58
Гараж, Бел.ручей. Подвал, яма. Т. 743 93 72
Деревянный дом, Заслонова-52. Тел. 5 84 85
Дом в д.Тимоховка с ХП. Брикет 8т. Т.4 81 46
Дом в стадии строительства+материалы, ул.Скорины,4. Т.5 28 07, 627 56 00
Дом под снос. Т. 549 26 09
Дом с мебелью в д.Попковка, хозпостройки, уч. 0,8га. Т.47 7 94
Дом с ХП д.Лебедево. Т. 3 63 59
Дом с хп Т. 5 95 49
Дом, Слобода. Т. 5 46 45
3-к кв. в центре. 70 м². Т. 240 60 43
Квартиру в районе Академии. Т.786 75 61
Кирпичный дом. Железнодорожная, 11. Т. 5 43 15
Полдома с документами в центре по ул.Социалистической. Гараж, летняя кухня, ХП. Участок 10 соток. Тел. 5 96 81, 542 38 08

Авто, мото

Ауди 80 переходная, 1,6 Д, аварийный перед. Срочно Т. 5437263
ВАЗ 21 093 97 г.в. Т. 685 41 77
ВАЗ 2104 после капремонта. Т. 740 59 70
ВАЗ 2106 по ЗЧ. Т. 185 67 83
ВАЗ 2107. 84г.в. на ходу + ЗЧ. Т. 605 83 79
ВАЗ 21073. Т. 743 93 72
Вольво -345. Цена дог. Т. 5 80 38
Запчасти к АМ Нива и Жигули. Т. 843 63 73
ЗЧ к Вольво 343 и Джетта -1. Т. 5 80 38. После 21.00
ИЖ –комби 84г.в. на ходу, либо на ЗЧ. Т. 5 79 88, 610 09 17
Коленвал с шатуном от минского мотоцикла. 50 тыс. Т. 916 77 59
М/автобус Фольксваген ЛТ 35 15 мест. 5500у.е. Т. в Орше 239 871, 355 63 41
Мазда 323F, 1997 г.в. недавно в РБ, 1,5i, ДОНС, 5100у.е (торг) Т. 029 676 22 41
Мот. Минск. 180000 руб. Т. 5 34 15
Мотоблок. Т. 5 75 06
Опель-Аскона в хорошем состоянии. Т. 461 27 13
Таврия на ЗЧ. Т. 5 54 45
Трактор Т-25 с телегой. Т. 743 66 07
Фиат-регата 86 г.в. Д. недорого. Т. 8 02137 3 64 52, 895 98 23
Ява 350 Т.112 15 61

Урожай

Круп. картофель. Т. 5 57 56, 335 03 65
Пшеница и ячмень. Т. 843 63 73
Пшеница. Т. 843 63 73

Живность

Рабочую лошадь. Ленино. Т. 3 87 61
Стельную корову 1 тели. Т. 5 54 90
Щенков Чау-чау с родословной. Т. 162 50 12
Петуха. Т. 843 63 73
Корову Т. 3 95 50
Лошадь 9лет. Т.3 41 56
Молодых индюков. Пара 30т. Т. 5 84 27, 247 26 45
Корову 5 телей. Т. 5 43 55, 391 93 26
Утят, 2 мес. Т. 5 38 69
Корова. Т. 8 02248 2 23 34, 352 07 52
Козлик 3 мес. Т. 842 17 23. После 18.00

Бытовая техника

ГП Гефест. Новая. Т. 5 69 46
Компьютер AMD Sempron2300+1,58ГГЦ. 258 MB; 80GB; CD-RW (читает и пишет), DWD-RW(читает и пишет все!), модем (Интернет), монитор 17" LG; клавитура, мышь, колонки с усил., системный блок в виде BMW, много полезных программ, фильмы, игры. Доставка, подключение. Возможно подкл. к Интернету. Т. 555 20 39
Компьютер, комп.стол. 400 у.е. Т. 848 91 63
Мельницу 220 в. новую. Т. 0216 298472, 719 42 95
Моторола V180, б/у, раскладушка, MP3 55 у.е.Т. 840 38 82
Моторола V620 б/у, расклад., фото, видео, MP3. Цена 70 у.е.Т. 742 195
Плиту газовую 2-камфорную. Т.612 55 59
Самсунг X460 отл.сост. Т. 5 17 19
Соковыжималку. Т. 843 63 73
Сот.тел. Motorolla V360, полный комплект, кабель, флэш, 512 МБ, наушники. Т. 029 872 25 38
Сот.тел.Soni Ericsson K300i, коробка, документы. 75 у.е. Т. 029 253 68 89
Спутниковую антенну Т. 029 216 35 41, 216 27 43
Холодильник Атлант 2к. немного БУ. 180 см. Т. 141 54 22, 5 34 85
Холодильник-морозильник Атлант. Т. 5 62 17
Швей.маш. Чайка. Т. 845 25 54

Всякая всячина

Стиральную машину "Рига", 70000 руб. Т. 5 37 98
Костюм школьный для мальчика, сорочка, галстук. Т. 5 83 68
Красивое свад. платье с аксессуарами. Т. 5 84 59
Коляска дет. Джип. Т. 934 38 03
Оконные блоки БУ дешево. Т. 668 77 74
Водосточные трубы, колена, воронка. Т. 612 55 59
Рамы оконные двойные 115х176. Т. 612 55 59
Водонагреватель новый в упаковке новый. Газ.плиту, кухню, стир. машину б/у в хор. сост. Т. 36 5 85
Лодку надувную двухместную. Т. 5 90 78
Мужской костюм новый р.188-104-94. Т. 741 54 19, 5 03 36
Цимбалы б/у, недорого. Т. 5 04 45, 849 09 65
Шкаф, стенка, мягк.уголок, телевизор. Все БУ. Т. 5 09 62
Гармошку "Тульскую", детский баян. Т. 5 05 06
Выпускное платье с корсетом и перчатками, нежно-розовое. Т. 5 08 58
Алюминиевые листы. 1,20 х1м. х 0,5м., стол кухонный, одежда БУ мужская и женская. Р. 50-52. Т. 843 63 73
Фляга молочная, 40л. Листы алюминиевые 1м Х 1,2м., стол кухонный, бочку металлич. Т. 843 63 73
Диван БУ шир. 1,3м. Расклад. вперед Т. 142 56 09
Ванну 1,7м. Т. 5 61 81

КУПЛЮ

1к. кв. Т. 5 96 58
Гараж в р-не КБО. Т. 5 32 98
Запорожец (горбатый). Т. 695 32 72
Или сниму гараж в р-не Академии. Т. 5 69 46
Коттедж. Т. 48 4 38
Лодку надувную 2-мест. Т. 5 90 78
Мотоблок с тележкой. Т. 5 90 78
Мотоцикл ИЖ-Планета, можно без документов. Т. 5 33 09
Трельяж. Т.5 03 36, 741 54 19

СНИМУ

1к.кв. 1 чел. на длит. срок. Т. 679 35 56, или в Могилеве 8 0222 46 63 07
Гараж. Т. 698 85 61, 5 90 20
Кв. в Горках. Т. 385 3397
Молодая семья снимет 1-2к.кв. на длит. срок. Т. 029 676 22 41
Семья снимет кв. на длит. срок. Т. 47 5 42, 546 57 11

ИЩУ РАБОТУ

Женщина без вредных привычек ищет любую работу. Т. 5 40 81, 167 13 74
Ищу работу отделочника. 847 94 29
Ищу работу разнорабочего. Рассмотрю все варианты. Т. 549 64 97

МЕНЯЮ

4к.кв. Строителей на 1-2 к. т. 195 53 68
Дом в г.Горки, Слобода, жилая пл. 48 кв.м. огород 10 сот. на 1 или 2 к. кв. или продам. Т. 5 89 34

НУЖДАЮСЬ

В услугах паркетчика. Т.5 27 04
В услугах тамады. Т. 5 98 15, 745 91 61
В услугах художника по камню. Т. 132 70 34

ПОДАРЮ

Добрым людям кошечку 2,5 мес. Т. 5 75 21
Котенка 6 мес. в хор. руки. Т. 5 58 06
Щенка (девочку) в хор. руки. Т. 5 64 22, 247 08 72

ПРОПАЖИ

Флешка USB. просьба вернуть за вознаграждение. Т. 748 32 82, 697 82 68

Официально

Если ты попал в трудную ситуацию, обратись в отделение по гражданству и миграции

Как это ни страшно и ни странно звучит, но даже в наши дни возможность стать жертвой торговли людьми очень велика. Ежегодно тысячи белорусов подвергаются различным видам эксплуатации: сексуальная эксплуатация, принудительный труд и т.д.

Человек, который поехал за границу через юридических или физических лиц, не имеющих специальное разрешение (лицензию) на вывоз граждан за границу часто теряет практически все: собственность, личные сбережения, крышу над головой, родных и близких и даже собственное имя. Ему приходится долго и трудно приспосабливаться к жизни в новой стране, учится говорить на другом языке и привыкать к иному укладу жизни в стране, в которой его завербовали для работ, зачастую для лиц женского пола такая работа — занятие проституцией.

Мы помогаем всем пострадавшим независимо от их личных качеств, рода занятий, религиозных убеждений, национальности, расы, семейного положения и т.д.

В мире нет большего нарушения прав человека, чем лишение права на человеческое достоинство. Женщин в ходе сексуальной торговли продают и покупают как товар и доставляют тому, кто заплатит большую цену. Они существуют в мире теней, где их полные душевной муки голоса заглушаются постоянной угрозой насилия по отношению к ним.

Планируя свой отъезд необходимо выполнить следующие условия:

1. внимательно проверьте предложение о трудоустройстве за границей;
2. заключите договор о трудоустройстве до выезда за рубеж;
3. свяжитесь с посольством страны, в которую Вы намерены поехать;
4. поставьте в известность своих близких о Вашем отъезде на работу;
5. оставьте дома точный адрес планируемого места пребывания;
6. оформите страховку от несчастных случаев и болезней;
7. возьмите определенную сумму денежных средств на транспортные расходы для возможного возвращения домой;
8. узнайте адрес и телефон посольства Республики Беларусь в стране назначения.

Если Вам известна какая-либо информация по вопросу трудоустройства граждан Республики Беларусь за границей, не имея на то специального разрешения (лицензии), либо Вы сами попали в такую ситуацию, просим сообщить в отделение по гражданству и миграции Горецкого РОВД по телефону: 5-88-60.

С.Н. Таранов, инспектор ОГиМ Горецкого РОВД

РОДИЛИСЬ

17 СЕНТЯБРЯ

Сергей Петрович БОТКИН (1832-24.12.1889) врач-терапевт, обнаруживший причины желтухи. Его сын был расстрелян вместе с царской семьей.

18 СЕНТЯБРЯ

Грета ГАРБО /Грета Ловиса ГУСТАФССОН/(1905-15.4.1990) легендарная киноактриса. Она родилась в Швеции, а после того, как стала сниматься в кино, переехала в США. Всего она снялась в 27 фильмах (два поставлены в Швеции, один в Германии, остальные - в Голливуде). В 36 лет Грета оставила кино и всю оставшуюся жизнь провела в уединении в Нью-Йорке.

19 СЕНТЯБРЯ

Никита Акинфиевич ДЕМИДОВ (1724-1789) промышленник, владелец Тагильских заводов. Этот представитель 3-го поколения знаменитого рода горнозаводчиков заслужил самые нелестные оценки. Самодурство и скупость не уравновешивались у него широтой размаха и умом. Его крестьяне не раз заявляли, что "все готовы помереть, а за Демидовым быть не хотят", а рабочие жаловались на чрезвычайно низкую плату. Он любил разыгрывать роль мецената и просвещенного человека и добился звания почетного члена Академии художеств и Вольного экономического общества, завел переписку с ВОЛЬТЕРОМ, поскольку этого требовали правила хорошего тона. Во время заграничного путешествия покупал все, что на глаза попадалось, потому что все равно некуда было девать денег. Богатство было хорошей рекомендацией, и Демидов не считал достойным себя спускаться ниже самых вершин аристократического заграничного общества. Сам Демидов смотрел на такое препровождение времени как на какой-то великий подвиг, который должен стяжать ему славу у современников.

20 СЕНТЯБРЯ

Давид ТУХМАНОВ (1940) композитор, автор песен («День Победы», «По волне моей памяти»).

21 СЕНТЯБРЯ

Герберт УЭЛЛС (1866-13.8.1946) английский писатель-фантаст («Война миров», «Машина времени», «Человек-невидимка»).

22 СЕНТЯБРЯ

Сергей Иванович ОЖЕГОВ (1900-15.12.1964) языковед.

23 СЕНТЯБРЯ

Роберт БОШ (1861-9.3.1942) немецкий инженер, придумавший свечу зажигания и магнето, основатель фирмы "Бош".

ПОНЕДЕЛЬНИК, 17 СЕНТЯБРЯ

1-ЫЙ

6.10, 16.40 Т/с "Право на счастье".
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.05 Новости.
7.05, 8.10 Доброе утро, Беларусь!.
7.25, 8.25, 11.50 Деловая жизнь.
7.45, 8.45, 18.50, 0.25 Зона Х.
8.20 Готовим вместе!.
9.05, 20.00 С-л-фэнтази "Молодой Волкодав".
9.50 Панорама недели.
10.55, 17.40 Телевизионная сага "Любовь как любовь".
12.10 Драма "Требуется няня".
14.05 Здоровье.
14.35 Nota Bene.
15.15, 19.25 Новости региона.
15.30 Культурные люди.
15.55 "Звездная монополия, или Как рождается мюзикл".
19.35 Время спорта.
21.00 Панорама.
21.45 Х/ф "Тигровые бригады".
0.30 Все стихии.
1.00 Футбол. Журнал Лиги чемпионов.

ОНТ

6.00, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00, 3.00, 5.00 Наши новости.
6.05 "Пока все дома".
7.05 "Наше утро".
9.05 Контуры.
10.10 Фильм "Лишний багаж".
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.15, 3.20 Новости спорта.
11.10 Прдолжение фильма "Лишний багаж".
12.00 "Малахов+".
13.10 С-л "Моя прекрасная няня".
13.40 "Федеральный судья".
14.30 "Контрольная закупка".
15.00 "Лолита. Без комплексов".
16.15 Фильм "Мой лучший любовник".
18.20 С-л "Братья по-разному".
18.55 Жди меня.
20.00 Время.
21.05 "Выбор".
22.00 Премьера сезона. "След".
23.20 "Любовные треугольники".
0.20 "Фабрика звезд".
0.50 Х/ф "Убойная сила".
1.40 Х/ф "Коварство гор".
2.35 "Понять.Простить".
3.30 Техническая профилактика.
5.05 "Пусть говорят".
5.45 "Шутка за шуткой".

РОССИЯ

7.00 Доброе утро, Россия!.
9.10 "Эфир как предчувствие".
10.00 "Комната смеха".
10.45, 13.45 Дежурная часть.
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Вести.
11.30 Местное время. Вести-Москва.
11.50 "Фитиль".
12.45 Т/с "Тотализатор".
14.10 Местное время.
14.30 Комедия "Невыносимая жестокость".
16.10 "Городок. Дайджест. Развлекательная программа".
17.20 Местное время. Вести-московская область.
17.50 Т/с "Ангел-хранитель".
18.50, 23.00 Вести – Беларусь.
19.45 Спокойной ночи, малыши!.
20.00 Т/с "Евлампия Романова. Следствие ведет дилетант-2".
21.55 С-л "Огнеборцы".
22.55 Т/с "Большая любовь".
23.10 Вести +.
23.30 "Мой серебряный шар".
0.30 "Честный детектив".
1.00 "Синемания".

НТВ

6.00 "Сегодня утром".
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Сегодня.
9.00 "Смотр".
9.30 "Чрезвычайное происшествие". Обзор за неделю.
10.20 "Кулинарный поединок".
11.20 "Квартирный вопрос".
12.15 "Следствие вели...".
13.30 Боевик "Шпионские игры".
15.20, 0.05 "Профессия-репортер".
15.30, 18.30 "Обзор. Чрезвычайное происшествие".
16.30 Детектив "Возвращение Мухтара-2".
19.40 Детектив "Опера. Хроники убойного отдела. Ищи деньги".
20.50 Детектив "Эра Стрельца".
22.30 "Бальзаковский возраст, или Все мужики сво...-3". С-л
23.35 "Криминальная Россия".

СТВ

6.05, 17.20 "Минщина".
6.15 "С чего начинается утро".
7.30 "Неделя с Еленой Ходорёнок".
8.45 "Большой завтрак".
9.20 "Рожденные в СССР".
10.00 "Спортивная неделя".
10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 "24 часа".
10.40 "Одиночество в толпе. Николай Губенко". Видеофильм.
11.05, 18.25 Т/с "За все тебя благодарю 2".
12.00 "Профессиональный бокс".
13.00 "Есть контакт".
13.50 "Детский сеанс": "Каникулы Кроша". СССР, 1980г.
15.00 "Город детства".
15.15 "Частные истории".
16.00 "Культурная жизнь".
16.50 "Бабий бунт". Ток-шоу.
17.30 "Званый ужин".
20.05 "СТВ-спорт".
20.15 "Добрый вечер, малыш".
20.30 Т/с "Солдаты 7".
21.40 "Добро пожаловаться".
22.00 "Репортер СТВ".
22.55 "Столичный футбол".
23.25 "Секретные истории".
0.15 Детектив "Скала Малхолланд".

ЛАД

7.00 Утренняя подзарядка.
